**УДК 334.72.4(476)** **DOI 10.52928/2070-1632-2022-62-12-28-34**

# МАЛОЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА: НАПРАМКІ РОСТУ ДЗЕЛАВОЙ АКТЫЎНАСЦІ

***канд. экан. навук, дац. Г.К. КРАМАРЭНКА***
***(Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт)***

*У артыкуле прыведзены высновы даследавання асаблівасцей развіцця мікра- і малых прадпрыемстваў (МП) у краінах ЕС і Беларусі за 2005 – 2020 гг. Дынаміка асноўных паказчыкаў дзейнасці МП прыведзена ў кантэксце аналізу ўмоў вядзення бізнэсу ў гэтых краінах. Прадстаўлена група мер дзяржаўнага рэгулявання МП з пазіцыі іх узаемасувязі з асноўнымі напрамкамі ўдзелу МП у вырашэнні рэгіянальных эканамічных задач. Па даных анкетавання кіраўнікоў МП аўтарам выдзелены праблемы дзейнасці МП. Прапанавана методыка разліку інтэнсіўнасці развіцця МП і ацэнкі яго ўплыву на рост эканомікі з пазіцыі ствараемага прадукта для ўдакладнення існуючага метадычнага інструментарыя прагназавання развіцця МП. Даследаванне накіравана на выкарыстанне ў большай меры патэнцыялу МП Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *мікра- і малыя прадпрыемствы, дзелавое асяроддзе, дзяржаўнае рэгуляванне прадпрымальніцтва.*

**Уводзіны.** Ва ўмовах міжнародных санкцый, якія прадугледжваюць абмежаванні на гандлёвую і эканамічную дзейнасць прадпрымальнікаў Беларусі з замежнымі краінамі, роля мікра- і малых прадпрыемстваў (МП) у рашэнні задачы імпартазамяшчэння надзвычай высокая, нельга яе недаацэньваць. У гэтым пытанні МП могуць дапамагчы эканоміцы за кошт паставак на ўнутраны рынак падобных тавараў айчыннай вытворчасці, тым самым забяспечваючы працай мясцовае насельніцтва і памяншаючы залежнасць ад імпарту[1]. Дзякуючы гэтаму, МП здольныя знізіць залежнасць ад санкцыённых абставін. Удзел малога бізнэсу ў імпартазамяшчэнні ў галінах эканомікі магчымы толькі ў выпадку наяўнасці адпаведных вытворчых магутнасцей і выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі па рыначных цэнах. Зніжэнне імпартнай залежнасці краіны магчыма за кошт выкарыстання МП інавацый і стымулявання інвестыцый у галінах эканомікі, стварэння новых вытворчасцей.

У Беларусі існуюць праблемы, якія ўплываюць на развіццё МП. Неабходна выявіць найважнейшыя з іх і магчымасці іх рашэння. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць частковага ўдасканалення існуючай сістэмы дзяржаўнай падтрымкі МП. Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз становучага вопыту развіцця і падтрымкі МП замежных краін, а таксама выяўленне магчымасці яго прымянення ў беларускіх умовах.

**Асноўная частка.** Малое прадпрымальніцтва з'яўляецца асновай эканомікі, якая функцыянуе па законах попыту і прапановы з перавагай прыватнай уласнасці і свабоды выбару. МП маюць патэнцыял у вырашэнні эканамічных (эфектыўнае выкарыстанне рэсурсаў) і сацыяльных (беднасць, гендэрная няроўнасць, высокі ўзровень беспрацоўя, інш.) праблем. Яны забяспечваюць стварэнне новых працоўных месцаў, папаўненне бюджэту, развіццё наватарства і інавацыйнай дзейнасці. Таксама яны ўносяць пэўны ўклад у фарміраванне канкурэнтнага асяроддзя[2] [2, с. 135], што для развіцця эканомікі мае першаснае значэнне.

Уплыў МП на эканоміку Беларусі і неабходнасць удасканалення дзелавога асяроддзя МП падкрэслівалі многія вучоныя. У навуковых працах В.Л. Сімановіч, М.І. Балашэвіч, Т.П. Быкавай, В.Я. Лялінай, У.І. Ляшэнкі, К.В. Паўлавай, В.В. Хахулінай, І.В. Мальгінай, В.В. Тышлека, Г.А. Яшавай, В.Г. Вайнулавай і інш. былі дэталёва разгледжаны дадзеныя пытанні з пазіцыі навуковых інтарэсаў гэтых вучоных. Так, В.Л. Сімановіч раскрывае дадзеную праблему з пазіцыі ўплыву інавацыйнай дзейнасці МП на развіццё рэгіянальнай эканомікі. На думку М.І. Балашэвіча, МП шмат у чым вызначаюць тэмпы эканамічнага росту, занятасці насельніцтва, вызначаюць структуру і якасць ВУП. Т.П. Быкава вывучае ролю МП у прыцягненні фінансавых сродкаў у нацыянальную эканоміку, акцэнтуе ўвагу на пытаннях аб суадносінах дзяржаўнага рэгулявання і самарэгулявання МП. К.В. Паўлаў вывучае перспектывы ўдзелу МП у працэсэ прыстасавання эканомікі і сацыяльнай сферы да сучасных рэалій. Шэраг іншых беларускіх вучоных акцэнтуюць увагу на інвестыцыйным патэнцыяле МП, выкарыстанні імі інвестыцыйных рэсурсаў рэгіёну [1, с. 20; 2, с. 102]. У цэлым, пры аглядзе навуковых прац у гэтай галіне можна вызначыць наступныя падыходы да абгрунтавання ўплыву МП на эканоміку Беларусі: разглядаюцца аспекты ўплыву ў іх сукупнасці і ўзаемасувязі; дэталёва аналізуюцца асобныя аспекты ўплыву МП на эканоміку Беларусі (эканамічны, фінансавы, кіраўнічы, псіхалагічны, сацыяльны, інш.). У дадзеным артыкуле будуць прыведзены высновы з праведзенага даследавання заканамернасцей развіцця мікра- і малых прадпрыемстваў у замежных краінах і Беларусі за 2005 – 2020 гг.; будуць выяўлены магчымыя кірункі росту дзелавой актыўнасці беларускіх МП з улікам становучага вопыту замежных краін па падтрымцы дзейнасці такіх суб'ектаў.

Роля і месца МП у сістэме эканамічных адносін, канкурэнтаздольнасці эканомікі, нацыянальнай бяспекі ў многім залежаць ад узроўню развіцця нацыянальнай эканомікі, гісторыка-культурных асаблівасцей краіны. Аналіз дзейнасці МП у краінах ЕС за 2005 – 2020 гг. прывёў к наступным вынікам. Так, у ЕС сярэдняя колькасць работнікаў МП складае не больш за 20 чалавек. МП забяспечваюць 2/3 прыросту новых працоўных месцаў. Доля

[1] DOI: https://doi.org/10.46782/1818-4510-2022-1-17-34.
[2] DOI: https://doi.org/10.29235/1817-7204-2020-58-2-135-142.

МП у ВУП складае каля 55% [1, с. 28]. У ЕС існуюць наступныя крытэрыі вызначэння МП: колькасць працуючых – не больш за 49 чалавек; тавараразварот – не больш за 40 млн. еўра; балансавы кошт актываў – не больш за 27 млн. еўра. На малюнку 1 прыводзяцца і супастаўляюцца тэмпы росту аб'ёмаў вытворчасці, колькасці МП, колькасці работнікаў МП у ЕС за 2005 – 2020 гг. Дадзеныя паказчыкі адлюстроўваюць інтэнсіўнасць развіцця МП. Найбольшыя значэнні іх прыпадаюць на 2011, 2014 і 2020 гг.[3].




**Малюнак 1. – Паказчыкі дзейнасці МП у эканоміцы ЕС, %**

Па дадзеных дыяграмы відаць, што ў ЕС за 2005 – 2020 гг. назіраецца рост колькасці МП, які ў сярэднім па краінах склаў 106% у год. Для МП характэрна высокая шчыльнасць у разліку на 1000 жыхароў. У сярэднім па краінах яна вагаецца ад 35 да 55 МП. Найбольш высокія значэнні паказчык дасягае ў Чэхіі – 86, у Партугаліі – 83, у Іспаніі – 72, у Італіі – 68, у Швецыі – 65 [1, с. 28], дзе шматбакова стымулюецца самазанятасць, падтрымліваецца арганізацыя ўласнай справы. Для параўнання, доля буйных прадпрыемстваў у агульнай колькасці суб'ектаў прадпрымальніцтва ў ЕС складае да 1%, а іх шчыльнасць у разліку на 10000 жыхароў – у сярэднім па краінах 1 суб'ект [1, с. 28]. МП у ЕС працаўладкоўвае каля 45% насельніцтва. У большай колькасці гэта жыхары буйных гарадоў, занятыя ў сферы паслуг. За 2005 – 2020 гг. выяўлены адносна ўстойлівыя штогадовыя тэмпы росту колькасці работнікаў МП, якія ў сярэднім па краінах ЕС склалі каля 102,5% у год. У 2020 г. значную занятасць насельніцтва на МП мелі Германія (54%), Францыя (53%), Швецыя (47%), Аўстрыя (52%), Польшча (47%)[4], а сярэдняя колькасць занятых на адным мікрапрадпрыемстве склала 4 чалавекі, на адным малым прадпрыемстве – каля 15 чалавек (табліца 1). Такія паказчыкі адлюстроўваюць вытворчую моц прадпрыемстваў. Для параўнання, адно буйное прадпрыемства забяспечыла працай каля 670 чалавек.

Табліца 1. – Сярэдняя колькасць занятых на адным МП у замежных краінах, 2019 – 2020 гг.[5]*

| Краіна | Насельніцтва, млн. чал. | Сярэдняя колькасць занятых, чал. | Адхіленне ад сярэдн. знач. паказчыка, чал. |
|---|---|---|---|
| Аўстрыя | 8,92 | 15 | +7 (187,50 %) |
| Бельгія | 11,56 | 7 | -1 (87,50 %) |
| Данія | 5,83 | 9 | +1 (112,50 %) |
| Фінляндыя | 5,53 | 5 | -3 (62,50 %) |
| Францыя | 67,39 | 7 | -1 (87,50 %) |
| Германія | 83,24 | 9 | +1 (112,50 %) |
| Грэцыя | 10,72 | 5 | -3 (62,50 %) |
| Ірландыя | 5,00 | 9 | +1 (112,50 %) |
| Італія | 59,55 | 4 | -4 (50,00 %) |
| Люксембург | 0,63 | 11 | +3 (137,50 %) |
| Нідэрланды | 17,44 | 11 | +3 (137,50 %) |
| Партугалія | 10,31 | 5 | -3 (62,50 %) |
| Іспанія | 47,35 | 5 | -3 (62,50 %) |

Дадзеныя табліцы 1 паказваюць, што на доследных прадпрыемствах працавала ў 2019 – 2020 гг. у сярэднім ад 4 да 15 супрацоўнікаў (гэта тыповая характарыстыка МП). Найбольшае значэнне паказчыка было дасягнута ў Аўстрыі, Люксембургу, Нідэрландах, што звязана з умовамі ўнутранага рынку гэтых краін (тут пакупніцкая здольнасць спажыўцоў вышэйшая за сярэднюю па краінах ЕС).

[3] URL: https://op.europa.eu/en/publication-detail/-/publication/849659ce-dadf-11eb-895a-01aa75ed71a1. URL: http://ec.europa.eu/eurostat/tgm/refreshTableAction.do?tab=table&plugin=1&pcode=tec00011&language=en.
[4] Там жа.
[5] URL: http://ec.europa.eu/eurostat/tgm/refreshTableAction.do?tab=table&plugin=1&pcode=tec00011&language=en.

У ЕС уклад МП у ВУП высокі. Яго сярэдняе значэнне складае каля 35%; па галіновай структуры: у сферы паслуг – каля паловы ВУП краіны, у прамысловасці – сёмую частку (каля 15%). МП вырабляюць кожны трэці прадукт (кожны сёмы тавар або аказваюць кожную другую паслугу)[6] [1, с. 28–29]. МП у краінах араентаваны на захаванне культурнай спадчыны, прыкмет ідэнтычнасці ў вытворчасці тавараў і паслуг. У цэлым, аналіз паказчыкаў дзейнасці МП у эканоміцы краін ЕС вызначыў асноўныя фактары іх фарміравання: прыватная ўласнасць мае на ўвазе вялікую адказнасць за вынік прадпрымальніцкай дзейнасці; гнуткасць вытворчых магчымасцей МП садзейнічае павышэнню вынікаў прадпрымальніцкай дзейнасці; інавацыі ўкараняюцца хутчэй у параўнанні з сярэднімі і буйнымі прадпрыемствамі; тэхналагічныя інавацыі больш актыўна выкарыстоўваюцца ў арганізацыі працы; дзейнасць МП дазваляе рэалізоўваць інвестыцыі ў найкарацейшыя срокі; канкурэнцыя паміж МП пашырае выбар для спажыўцоў; высокая прыстасаванасць да рыначных умоў і зменлівасці спажывецкага попыту; злучэнне ўласніка і кіраўніка ў адной асобе спрыяюць прадпрымальніцкай ініцыятыве; невялікая колькасць супрацоўнікаў спрыяе карпаратыўнасці і ўзаемадапамозе; для дзейнасці МП характэрна высокая хуткасць абмену дзелавой інфармацыі; малая забяспечанасць рэсурсамі спрыяе іх эканомнаму выкарыстанню.

Краіны ЕС дэманструюць прыклад шматбаковай дзяржаўнай палітыкі рэгулявання МП [1, с. 20–23]. Трэба адзначыць, што праблемы, на вырашэнне якіх накіравана дзяржаўнае рэгуляванне, у краінах ЕС падобныя. Адрозненні – у непасрэдных механізмах рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, ў арганізацыі тых ці іншых мерапрыемстваў. Галоўнымі мэтамі рэгулявання МП з’яўляюцца развіццё прадпрымальніцкіх сувязей і ўнутранага рынку, форм замежнай дзелавой актыўнасці МП, узаемадзеяння паміж прадпрыемствамі. У ЕС рэгуляванне МП ажыццяўляецца на чатырох узроўнях: паміж усімі краінамі ЕС, рэгіянальным, нацыянальным і мясцовым. Паміж усімі краінамі ЕС палітыка падтрымкі МП арыентавана на канкрэтнага чалавека, фірму і грамадства. Яе галоўнай мэтай з’яўляецца стварэнне адзінага рынку шляхам уніфікацыі заканадаўчай базы па МП, узаемадзеянне краін па стварэнні аб’яднанняў прадпрымальнікаў, камерцыялізацыі інавацый і стварэнні ўмоў для іх распрацоўкі. Для павышэння канкурэнтаздольнасці МП распрацоўваецца спецыяльнае заканадаўства. У ЕС створана Бюро па збліжэнні прадпрыемстваў, дзейнічае Еўрапейская асацыяцыя венчурнага капіталу (гэта еўрапейскі сектар прамых інвестыцый, венчурнага капіталу і інфраструктуры), Камітэт па спрашчэнні працэдур вядзення бізнэсу (створаны ў 2006 г.), Камітэт па садзейнічанні бізнэсу, сетка інфармацыйных цэнтраў (яны рэалізуюць меры па росце канкурэнтаздольнасці мясцовых МП за кошт скарачэння бюракратычных працэдур, ліквідацыі нарматыўных бар’ераў, інш.). У мэтах рэгулявання МП укаранёны юрыдычныя мадэлі: Еўрапейскі пул эканамічных інтарэсаў, Еўрапейская акцыянерная кампанія (яны вырашаюць задачы груп прадпрымальнікаў), інш. Усё гэта дае магчымасць МП вырашаць праблемы супярэчнасцей нацыянальных прававых сістэм. Рэгіянальная падтрымка МП ажыццяўляецца на аснове спецыяльных праграм, якія аб’ядноўваюць прыватных і/або дзяржаўных партнёраў для вырашэння надзённых праблем бізнэсу (напрыклад, у краінах Балтыйскага рэгіёну створаны Ганзейскі парламент (1994 г.), які мае адну з лепшых мадэляў у ЕС па абароне правоў прадпрымальнікаў). Задачамі рэгіянальнай палітыкі рэгулявання МП з’яўляюцца: падтрымка МП, больш уразлівых да негатыўных знешніх умоў, у рэгіёнах з нізкім узроўнем даходаў прадпрымальнікаў і нізкімі тэмпамі эканамічнага росту; падтрымка міжнароднай дзейнасці і міжнароднага супрацоўніцтва МП; пошук шляхоў атрымання прадпрымальнікамі і насельніцтвам высакаякаснай і інклюзіўнай адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі; абмен досведам дзелавога жыцця паміж МП (усё гэта арыентавана на рэгіянальныя асаблівасці МП). Аказваюцца розныя меры падтрымкі: арганізуюцца трэнінгі; ажыццяўляецца трансфер інавацый; праводзяцца навукова-даследчыя працы; бізнэс-форумы і інш. [1, с. 20–23].

Палітыка рэгулявання МП у ЕС зведала разнастайныя змены ў сувязі з эканамічнымі і палітычнымі фактарамі. Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі рэгулявання МП у кантэксце аналізу ўмоў вядзення бізнэсу ў краінах ЕС згрупаваны наступным чынам: фінансава-крэдытная, інвестыцыйная і падаткавая падтрымка; прыцягненне да выканання дзяржаўных заказаў; падтрымка экспартнай дзейнасці; падтрымка навуковых даследванняў і развіцця навукі; кадравая падтрымка; падтрымка МП, якія працуюць у сацыяльным сектары (табліца 2).

Табліца 2. – Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі рэгулявання МП у ЕС[7]

| Напрамкі | Сутнасць |
|---|---|
| 1 | 2 |
| Фінансава-крэдытная і інвестыцыйная падтрымка | 1. Выплата прэмій, якія залежаць ад вынікаў працы, паспяховым бізнэсмэнам за стварэнне бізнэсу.<br>2. Нізкія працэнтныя стаўкі па крэдытах МП на ўвесь тэрмін крэдытавання, працяглыя тэрміны крэдытавання (больш за пяць гадоў), разнастайная лінейка крэдытаў.<br>3. Гарантаванне дзяржавай (або спецыялізаванымі фінансавымі інстытутамі) да 60 – 80% крэдытаў МП з розным узроўнем прадуктыўнасці працы і ў розных галінах вытворчасці.<br>4. Прадастаўленне венчурнага капіталу маладым прадпрымальнікам і студэнтам у тэхналагічнай галіне, паслугі настаўнікаў у гэтай галіне.<br>5. Развіццё факторынгу з яго сегментаваннем па рэгіёнах (тэрыторыях), тыпах і прымяненнях |
| Падаткавая падтрымка, у т.л. дапамога у падрыхтоўцы падатковых дэкларацый | 1. Вызваленне ад шэрагу падаткаў прадпрымальнікаў на пачатковым этапе.<br>2. Зніжэнне карпаратыўнага падатку на працугу першых пяці гадоў працы.<br>3. Зніжэнне падаткавых ставак для МП у параўнанні з іншымі суб’ектамі прадпрымальніцтва.<br>4. Кансультаванне МП у падрыхтоўцы падаткавых дэкларацый |

[6] Гл. спасылку № 5.
[7] Там жа.

Канчатак табліцы 2.

| 1 | 2 |
|---|---|
| Прыцягненне МП да выканання дзяржаўных заказаў | 1. Заканадаўчае рэзерваванне вытворчасці пэўнага пераліку тавараў і работ МП.<br>2. Прыцягненне МП да выканання дзяржаўных заказаў у абароннай прамысловасці, іншых галінах эканомік |
| Падтрымка экспартнай дзейнасці МП, у т.л. індывідуальная падтрымка мясцовых МП на замежным рынку | 1. Кансультаванне па экспартнай дзейнасці і льготнае крэдытаванне экспартных праектаў.<br>2. Дапамога ў прыцягненні спецыялістаў, падаткавыя льготы і вызваленне МП ад пэўных патрабаванняў для выхаду на замежны рынак.<br>3. Кансультацыі па выкарыстанні IT, неабходных для выхаду МП на замежны рынак, для вырашэння спецыфічных патрэб замежнага рынку |
| Падтрымка навуковых даследванняў, развіцця навукі | 1. Прыняцце спецыяльных рэгіянальных праграм падтрымкі навуковых даследванняў, дапамога ў навукова-даследчых і даследча-канструктарскіх працах, грантавае фінансаванне.<br>2. Прадастаўленне навукаёмістым МП службовых, гандлёвых і іншых памяшканняў, дзелавой кантактнай інфармацыі.<br>3. Стварэнне і развіццё шматсектарных або арыентаваных на канкрэтную галіну “тэхнапаркаў”, “бізнэс-інкубатараў”, “прамысловых вулляў” |
| Кадравая падтрымка; падтрымка МП, якія працуюць у сацыяльным сектары | 1. Дзяржаўнае стымуляванне росту колькасці работнікаў МП.<br>2. Развітая сетка навучальных устаноў і бізнэс-школ.<br>3. Дзеянне праграм падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.<br>4. Платформы электроннага навучання з анлайн-курсамі для ўсіх спецыялізаваных відаў прадпрымальніцкай дзейнасці (па прадметных абласцях) |

*Крыніца:* [1].

У цэлым, замежны вопыт дзяржаўнага рэгулявання МП заслугоўвае ўсебаковага вывучэння і выяўлення магчымасцей выкарыстання станоўчага вопыту ў айчыннай практыцы.

Аналіз дзейнасці МП у Беларусі і параўнанне яго асноўных паказчыкаў з аналагічнымі паказчыкамі МП шэрагу краін ЕС, мэтавымі значэннямі асноўных паказчыкаў дзейнасці МП, якія ўстаноўлены ў Дзяржаўных праграмах падтрымкі МП, паказалі, што ўплыў дзейнасці МП на стан эканомікі ў рэгіёнах і нацыянальную эканоміку невялікі. У параўнанні з ЕС, у Беларусі склалася іншая сітуацыя. Унёсак МП у ВУП істотна ніжэйшы – каля 16%. Для параўнання, нават у краінах-партнёрах – 20 і 19% (Расія і Казахстан адпаведна) [1]. Гэты ўнёсак не адпавядае патрэбам эканомікі. За апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі ўмовы для вядзення бізнэсу прыкметна палепшыліся, што з’яўляецца вынікам дзеяння праграмм дзяржаўнай падтрымкі прадпрымальніцтва. Аднак да паказчыкаў прыведзеных краін беларускім МП яшчэ далёка. Колькасць стратных МП у рэспубліцы значная. Кожнае пятае МП стратнае[8]. Агульныя звесткі пра дзейнасць МП краіны прыведзены ў табліцах 3, 4 (на прадставе даных Белстата[9]).

Табліца 3. – Агульныя эканамічныя паказчыкі дзейнасці МП Беларусі

| Паказчыкі | 2005 | 2008 | 2010 | 2012 | 2015 | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць МП, адз. | 32243 | 60719 | 84164 | 97444 | 105047 | 105067 | 107726 | 108977 | 108542 | 109186 |
| Аб’ём вытворчасці прадукцыі, млрд. руб. | 10332 | 25374 | 43657 | 157894 | 224361 | 26297* | 31002* | 36014* | 41771* | 45996* |
| Аб’ём прамысловай вытворчасці, млрд. руб. | 4371 | 10750 | 14852 | 64768 | 68112 | 8205,1* | 9513,3* | 11364* | 12572* | 14149* |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал, млрд. руб. | 1033 | 4888 | 14928 | 40354 | 49422 | 4819* | 4757* | 5973* | 7991* | 8286* |
| Выручка ад рэалізацыі тавараў і паслуг, млрд руб. | 31768 | 70159 | 126388 | 413319 | 632689 | 71023* | 90602* | 108440* | 111453* | 110654* |
| Знешнегандлёвая дзейнасць, млн. дол. ЗША | 6973 | 12113 | 20279 | 26314 | 19138 | 17149 | 23087 | 28487 | 27209 | 21090 |

* – млн. руб. (з улікам маштабу дэнамінацыі)

Табліца 4. – Дадзеныя дзейнасці МП Беларусі ад агульных рэспубліканскіх паказчыкаў, %

| Паказчыкі | 2005 | 2008 | 2010 | 2012 | 2015 | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт | 7,9 | 9,3 | 12,3 | 15,1 | 13,7 | 14,2 | 14,9 | 14,7 | 15,6 | 15,6 |
| Аб’ём прамысловай вытворчасці | 7,0 | 8,2 | 8,9 | 10,5 | 9,3 | 10,1 | 10,2 | 10,4 | 11,0 | 12,0 |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал | 6,9 | 13,1 | 27,0 | 26,1 | 23,5 | 25,8 | 22,6 | 23,9 | 27,7 | 28,0 |
| Выручка ад рэалізацыі тавараў і паслуг | 21,2 | 20,7 | 27,9 | 26,7 | 28,2 | 28,9 | 31,6 | 32,2 | 30,9 | 29,6 |
| Знешнегандлёвая дзейнасць | 21,3 | 16,7 | 33,7 | 28,5 | 33,6 | 33,6 | 36,4 | 39,5 | 37,6 | 34,1 |

[8] URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/realny-sector-ekonomiki/strukturnaja_statistika.

[9] Там жа.

У Беларусі станоўчымі вынікамі дзяржаўнай палітыкі развіцця дзейнасці МП з’яўляюцца рост колькасці МП на 238,6% за перыяд 2005 – 2020 гг. (на 76 943 адз.), рост аб’ёму вытворчасці з 10 332 млрд руб. да 45 996 млн. руб. (з улікам маштабу дэнамінацыі). Агульны аб’ём прамысловай вытворчасці МП павялічыўся ў 18 разоў у параўнанні з 2005 г. У 2020 г. ён склаў 14 149 млн. руб. (з улікам маштабу дэнамінацыі), г. зн. 12% ад агульнага аб’ёму прамысловай вытворчасці ў рэспубліцы. Штогод расце ўнёсак МП у знешнегандлёвы зварот краіны. Рост інвестыцый МП у асноўны капітал сведчыць пра павелічэнне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. У цэлым, аналіз паказчыкаў табліц 3, 4 і асаблівасцей дзейнасці МП у Беларусі за 2005 – 2020 гг. дазваляе сцвярджаць наступнае: назіраюцца высокія тэмпы росту колькасці мікрапрадпрыемстваў, гэта суправаджаецца зніжэннем тэмпаў росту колькасці малых прадпрыемстваў; за прыведзены перыяд МП сканцэнтраваны ў сферах, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі і спецыяльных ведаў (больш за 40% прадпрымальнікаў занятыя аптовым і рознічным гандлем), галіновая структура МП застаецца стабільнай; назіраецца нераўнамернасць тэрытарыяльнага развіцця МП (засяроджванне МП у сталіцы і абласных цэнтрах); назіраецца значная колькасць стратных МП (у рэстаранным і гасцінічным бізнэсе – 42%, у гандлі – 23%, у прамысловасці – 21%); колькасць работнікаў МП павялічваецца ў 2,5 разы, аднак большая частка насельніцтва рэспублікі занята на буйных і сярэдніх прадпрыемствах; па галінах эканомікі размяшчэнне колькасці работнікаў МП у працэнтах ад агульнага рэспубліканскага паказчыка змяняецца нязначна; дынаміка змяненняў вытворчых паказчыкаў МП часта звязана са зменай колькасці МП і іх структурнага складу [1, с. 126–127]. Такія характарыстыкі назіраюцца напрацягу ўсяго даследаванага перыяду.

Даследванне таксама ўключыла спробы вызначыць асноўныя праблемы дзейнасці МП у Беларусі. У табліцы 5 прыведзены даныя анкетавання прадпрымальнікаў, кіраўнікоў суб’ектаў інфраструктуры падтрымкі малога прадпрымальніцтва ў Беларусі [1, с. 87]. Можна ўбачыць, што развіццё МП у Беларусі стрымліваецца мноствам фактараў. Пералічаныя ў табліцы 5 праблемы дзейнасці МП, выдзеленыя кіраўнікамі прадпрыемстваў, характарызуюць умовы развіцця малога прадпрымальніцтва ў Беларусі.

Табліца 5. – Асноўныя праблемы дзейнасці МП у Беларусі

| Назва праблемы | Адказы асоб анкетавання |
|---|---|
| Крэдытаванне дзейнасці | Праблемы закладной маёмасці, высокія працэнтныя стаўкі, аб'ём выдадзеных крэдытаў, абмежаваная крэдытная лінейка, умовы паручыцельства па крэдытах, высокія штрафы за невыкананне ўмоў крэдытнага дагавору, парадак пагашэння працэнтаў і асноўнага абавязку, інш. |
| Затрымкі тэрмінаў аплаты пакупнікамі пастаўленай прадукцыі, колькасць даўжнікоў па аплаце пастаўленай прадукцыі | Малая колькасць пакупнікоў (партнёраў), высокая залежнасць ад заказчыкаў, галіновыя рызыкі, нізкія штрафы за парушэнне тэрмінаў пастаўкі прадукцыі па ўмовах тэндэру, інш. |
| Складанасці па арэндзе маёмасці, высокая арэндная плата | Высокая арэндная плата за тэрытарыяльна выгадна размешчаную маёмасць, складанасці ў парадку арэнды маёмасці, тэрміны арэнды |
| Вялікая колькасць адміністрацыйных працэдур | Праблемы выканання працэдуры атрымання ліцэнзій, сертыфікацыі выпуску, маркіроўкі, тэхнічнай экспертызы, інш. |
| Высокая канкурэнцыя | Шматлікасць канкурэнтаў на рынку, рэклама, асартымент, інш. |
| Высокія штрафы | Высокія штрафы за парушэнні, выяўленыя пры правядзенні кантрольна-наглядных мерапрыемстваў, за парушэнні правілаў тэхнікі бяспекі; кіраўніцтва прадпрыемстваў лічыць, што з боку дзяржавы ўзмацняюцца кантрольна-наглядныя функцыі |
| Адток працоўных з прафесійнымі навыкамі, выпускнікоў ВНУ ў іншыя краіны | Адток і дэфіцыт кваліфікаваных рабочых, неабходнасць перападрыхтоўкі рабочых у сувязі з умовамі працы, магчымасць выканання работ вахтавым метадам у РФ, Польшчы; адток выпускнікоў ВНУ ў РФ, Польшчу, высокая цякучасць маладых кадраў, інш. |
| Іншыя | Цяжкасці прымянення дзеючага заканадаўства, цяжкасці ўкаранення IT эканамічнага і іншага прызначэння, памылкі ў бухгалтарскім уліку і справаздачнасці, абмежаваныя навыкі ў маркетынгу, цяжкасці пабудовы дзелавых адносін з партнёрамі, недастатковы ўзровень ведаў і кампетэнцый, цяжкасці пошуку дзелавой інфармацыі, інш. |

*Крыніца:* [1, с. 87; 5–7].

Пазначаныя кіраўнікамі праблемы маюць важнае значэнне, таму што яны вызначаюць здольнасць такіх прадпрыемстваў прыстасоўвацца ва ўмовах рыначнай кан’юнктуры. Вызначаные праблемы не з’яўляюцца крытычна значнымі. Яны дапускаюцца ў дзелавым асяроддзі. На думку кіраўнікоў, яны больш сур'ёзныя ў параўнанні з унутранымі функцыянальнымі праблемамі. Усё ж, пазначаныя цяжкасці патрабуюць ведаў для вырашэння іх у вядзенні гаспадарчай дзейнасці.

У ходзе даследвання стала відавочным, што для павышэння ўдзелу беларускіх МП у выкананні эканамічных задач, у тым ліку пераймання станоўчага вопыту развіцця МП замежных краін, неабходна ўдасканаленне метадычнага інструментарыя прагназавання развіцця МП, які дазваляў бы даць своечасовую практычную ацэнку намечаных змен у дзяржаўнай палітыцы. Распрацоўка такога інструментарыя пасадзейнічае і больш эфектыўнаму выкарыстанню рэгіянальных рэсурсаў. У якасці складовай часткі інструментарыя прапануецца выкарыстоўваць аўтарскі інструментарый методыкі даследвання змяненняў паказчыкаў гаспадарчай дзейнасці МП, які дасць

магчымасць колькасна ацаніць узаемасувязь фактарнага і асноўнага паказчыкаў іх дзейнасці. Метадычны інструментарый накіраваны на выяўленне значнасці доследнага фактарнага паказчыка для дынамікі асноўнага паказчыка дзейнасці МП. Прапанаваная методыка разліку інтэнсіўнасці развіцця МП і ацэнкі яго ўплыву на рост эканомікі краіны з пазіцыі створанага прадукта выкарыстоўвае апарат ацэнкі структурных змен у развіцці МП. Ужыванне прапанаванай методыкі дазваляе выявіць інтэнсіўнасць уплыву фактарных паказчыкаў развіцця МП на аб'ём створанага імі прадукта, ступень уплыву змен структуры МП па відах эканамічнай дзейнасці на агульны аб’ём гатовага прадукту ў краіне. Методыка ўключае пабудову крывых рухомасці змен доследных паказчыкаў і разлік каэфіцыентаў структурнага эфекту ад уведзеных новаўтварэнняў. Значэнне каэфіцыента структурнага эфекту ад магчымых змен пакажа дынаміку інтэнсіўнасці ўплыву фактарнага паказчыка развіцця МП на асноўны паказчык. Прымяненне прапанаванай методыкі ў нейкай меры дасць магчымасць удасканаліць рэалізацыю інструментаў дзяржаўнага рэгулявання развіцця МП у адпаведнасці са спецыфікай іх развіцця. Методыка больш падрабязна прадстаўлена ў дысертацыйным даследванні і апрабавана ў дзейнасці мясцовых улад г. Брэста і Брэсцкай вобласці [1, с. 109].

**Заключэнне**. Дзяржаўная палітыка, што праводзіцца ў Беларусі, патрабуе развіцця канкурэнтнага асяроддзя праз дзейнасць малых прадпрыемстваў. Традыцыйна асноўнымі суб’ектамі нацыянальнай эканомікі з’яўляюцца буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія ва ўмовах міжнародных санкцый адносна павольна прыстасоўваюцца да новых фактараў. Рэалізацыя задачы імпартазамяшчэння выклікае неабходнасць больш інтэнсіўнага развіцця МП. Даследванне развіцця МП за 2005 – 2020 гг. дазволіла прасачыць існуючыя ўмовы вядзення гаспадаркі у краінах ЕС. У Беларусі за гэты перыяд колькасць МП узрастае, аднак сярод іх назіраецца высокая стратнасць дзейнасці. Удзел МП у ВУП, прамысловай вытворчасці, забеспячэнні занятасці насельніцтва невысокі і недастатковы ва ўмовах існуючай падтрымцы малога бізнэса дзяржавай. Таксама ён недастатковы ў сучаснай рыначнай сітуацыі. Паказчыкі дзейнасці айчынных МП фарміруюцца пераважна малымі прадпрыемствамі (не мікрапрадпрыемствамі), сярод якіх фіксуецца высокая стратнасць дзейнасці. Можна зрабіць вынік, што МП не рэалізуюць магчымасці развіцця ў поўнай меры. На нашу думку, для сучаснай Беларусі найважнейшую ролю ў развіцці МП (сярод функцый кіравання) павінна адыгрываць планаванне, якое павінна грунтавацца на прагназаванні. Для павышэння дакладнасці прагназавання неабходны деталёвы аналіз цяперашніх і будучых дзелавых умоў. Прапанаваная методыка разліку інтэнсіўнасці развіцця МП і ацэнкі яго ўплыву на рост эканомікі краіны з пазіцыі створанага прадукта можа выкарыстоўвацца як складовая частка такога інструментарыя. Яна дазволіць праводзіць перыядычную ацэнку, што актуальна ў сувязі з няўстойлівасцю рыначных абставін.

Беларусь можа пераняць станоўчыя бакі рэгулявання МП замежных краін, аднак пры гэтым неабходна ўлічваць нацыянальныя эканамічныя, сацыяльныя і культурныя асаблівасці. Прымяненне метадычнага інструментарыя павысіць дакладнасць дзяржаўнай палітыкі і забяспечыць ее гнуткасць.

ЛІТАРАТУРА


1. Крамаренко, А.К. Малое предпринимательство в Республике Беларусь: методическое обеспечение и пути развития : дис. … канд. экон. наук : 08.00.05 / А.К. Крамаренко. – Брест, 2019. – 216 л.
2. Крамаренко, А.К. Отдельные направления реализации государственного регулирования деятельности малого предпринимательства в Республике Беларусь / А.К. Крамаренко // Вестн. Брест. гос. техн. ун-та. Сер. Экономика. – 2018. – № 3(105). – С. 102–106.
3. Мальгина, И.В. Малое и среднее предпринимательство: цифровая экономика и трансформация / И.В. Мальгина // Проблемы управления. – 2019. – № 1. – С. 40–44.
4. Беляцкий, Н.П. «Квантовые скачки» бизнеса / Н.П. Беляцкий // Наука и инновации. – 2019. – № 11. – С. 64–68.
5. Бутеня, В.Е. Влияние инноваций и информационных технологий на трансформацию современного бизнеса / В.Е. Бутеня // Науч. тр. Белор. гос. экон. ун-та. – 2021. – Вып. 14. – С. 58–64.
6. Руденко, Л.Г. Государственная поддержка развития малого и среднего предпринимательства в условиях цифровизации / Л.Г. Руденко // Государственное регулирование экономики и повышение эффективности деятельности субъектов хозяйствования : материалы XV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 25–26 апр. 2019 г. / Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь ; редол.: Н. Л. Бондаренко [и др.]. – Минск, 2019. – С. 97–98.
7. Мальгина, И.В. Поддержка цифровизации малого и среднего предпринимательства / И.В. Мальгина // Наука и инновации. – 2021. – № 2. – С. 52–55.


*Паступіў 29.07.2022*

## МАЛОЕ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВО: НАПРАВЛЕНИЯ РОСТА ДЕЛОВОЙ АКТИВНОСТИ

***канд. экон. наук, доц. А.К. КРАМАРЕНКО***
***(Брестский государственный технический университет)***

*В статье приведены выводы исследования особенностей развития микро- и малых предприятий (МП) в странах ЕС и Белоруссии за 2005 – 2020 гг. Динамика основных показателей деятельности МП приведена в контексте анализа условий ведения бизнеса в указанных странах. Представлена группа мер государственного*

*регулирования МП с позиции их взаимосвязи с основными направлениями участия МП в решении региональных экономических задач. По данным анкетирования руководителей МП автором выделены проблемы деятельности МП. Предложена методика расчета интенсивности развития МП и оценки его влияния на рост экономики с позиции производимого продукта для уточнения существующего методического инструментария прогнозирования развития МП. Исследование направлено на использование в большей мере потенциала МП Белоруссии.*

***Ключевые слова:*** *микро- и малые предприятия, деловая среда, государственное регулирование предпринимательства.*

## SMALL BUSINESS: DIRECTIONS OF BUSINESS ACTIVITY GROWTH

***A. KRAMARENKO***
***(Brest State Technical University)***

*The article presents the conclusions of the research of the micro and small enterprises (MSE) development in EU and Belarus for 2005–2020. The dynamics of the main MSE indicators are given in the context of the business conditions. The grouping of MSE regulation measures from the standpoint of their interconnection with the main areas of MSE participation in solving regional economic problems is presented. According to the survey of MSE heads, the author highlighted the problems of MSE. The method calculation of the economic development MSE and assessment of its influence on the economic growth from the position of the created product is proposed to clarify the existing methodological tools for forecasting the development MSE. The research is aimed at maximizing the MSE potential in Belarus.*

***Keywords:*** *micro and small enterprises, business environment, government regulation of entrepreneurship.*